## § 11. Бежанства ў сучасным свеце

***Успамінаем.*** Па якіх прычынах людзі могуць пакідаць сваю краіну? Якая прычына з'яўляецца асноўнай у сучаснай міжнароднай міграцыі? Якія падзеі прымушаюць людзей пакідаць свае месцажыхарства?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Як вы думаеце, якая розніца існуе паміж паняццямі «бежанец» і «мігрант»? Якія праблемы цягне за сабой бежанства?

**Прычыны бежанства ў свеце.** Адной з форм палітычнай міграцыі з'яўляецца бежанства. Гэта форма міграцыі, у адрозненне ад іншых, найбольш моцна закранае правы чалавека і ніколі не бывае добраахвотнай. З другой паловы XX ст. яна носіць глабальны праблемны характар і з'яўляецца адным з самых складаных пытанняў, якія стаяць сёння перад сусветнай супольнасцю.

***У свеце ўсё ўзаемазвязана.*** У канцы XX – пачатку XXI ст. бежанства набыло найбольшыя маштабы за ўсю сваю гісторыю. З чым звязана значнае павелічэнне колькасці бежанцаў? Адказ абгрунтуйце.

Бежанства мае глыбокія гістарычныя карані. Так, у 1951 г. большасць бежанцаў былі еўрапейцамі. Сёння — гэта насельніцтва Азіі і Афрыкі. Калі раней бежанства ўяўляла з сябе вымушаныя міграцыйныя перамяшчэнні асобных людзей, то цяперашнія патокі бежанцаў усё часцей прымаюць масавую форму.

**У свеце цікавага.** Гісторыя чалавецтва поўная трагічных старонак, звязаных з бежанцамі. Яшчэ ў 695 г. да н. э. 50 тыс. чалавек беглі ў Егіпет, ратуючыся ад асірыйскай арміі цара Сінахерыба, якая ўступіла ў Іўдзею. На пачатку новай эры каля 300 тыс. готаў беглі ад нашэсця качэўнікаў-гунаў на землі Рыма. Працэс распаду Вялікай Рымскай імперыі пад ударамі варвараў суправаджаўся беспрэцэдэнтным «вялікім перасяленнем народаў». У VIII–IX стст. у выніку спусташальных уварванняў вікінгаў у Брытанію каля 40 тыс. астраўлян уцякалі ў Францыю. Тысячы людзей у Еўропе і Азіі ўцякалі ад частых эпідэмій чумы. Сапраўдныя масавыя ўцёкі пачаліся ў першай палове XIII ст., калі мангольскія орды, сеючы смерць і разбурэнні, прайшлі ад Ціхага акіяна да Міжземнага мора.

Прычыны сучаснага бежанства разнастайныя (мал. 72).

Галоўнай міжнароднай арганізацыяй па забеспячэнні правоў і дабрабыту бежанцаў з'яўляецца Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ). Яно была створана ў 1950 г. і каардынуе міжнародныя дзеянні па абароне бежанцаў і вырашэнні іх праблем незалежна ад расы, веравызнання, палітычных перакананняў і полу ў сусветным маштабе.

***Паразважаем.*** Як вы разумееце словы Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў Антоніу Гуцерэша (2005–2015): «Свет уступае ў новую эру, калі маштабы глабальнага прымусовага перамяшчэння насельніцтва засланяюць усё бачанае раней»? Адказ патлумачце.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 72. Прычыны бежанства ў свеце

**Геаграфія бежанства.** У сучасным свеце да росту бежанства прыводзяць як палітычныя і ваенныя канфлікты, так і вельмі нізкі ўзровень эканамічнага развіцця. Пры гэтым трэба разумець, што колькасць бежанцаў можа вагацца ў залежнасці ад актыўнасці падзей, якія адбываюцца. У параўнанні з 1990 г. колькасць бежанцаў у свеце ўзрасла і складае 22,5 млн чалавек (мал. 73). Гэта каля 10 % міжнародных мігрантаў. Большасць з іх — 89 % — з'яўляецца насельніцтвам краін, якія развіваюцца, і 19 % — развітых. У цяперашні час 80 % бежанцаў складаюць жанчыны і дзеці.




Мал. 73. Дынаміка колькасці бежанцаў ў свеце, млн чал.

**Свет і Беларусь.** Ці адчувае Рэспубліка Беларусь на сваёй тэрыторыі праблему бежанства?

Бежанцы размяркоўваюцца ў свеце па *краіне паходжання* і *па краіне прытулку* (*або прыёму*). Па краіне паходжання найбольшай колькасцю ў 2016 г. характарызаваліся **Сірыя**, **Афганістан** і **Паўднёвы Судан** (мал. 74). Асноўнымі прычынамі эміграцыі з'яўляюцца ваенныя дзеянні, нестабільныя эканамічныя абставіны, нізкі ўзровень жыцця і інш. Найбольшую колькасць бежанцаў прынялі Турцыя, Іарданія і Ліван (мал. 75).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 74. Найбуйнейшыя краіны па колькасці бежанцаў (па краіне паходжання), 2016, тыс. чал.




Мал. 75. Найбуйнейшыя краіны па прыёме бежанцаў, 2016, тыс. чал.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Найбольш складаная сітуацыя, якая прызнаецца УВКБ, склалася ў цяперашні час у Сірыі (мал. 76), Емене, Іраку, Паўднёвым Судане, Бурундзі і Нігерыі. Аднак кожны рэгіён стаў самастойнай пляцоўкай бежанства. У Афрыцы з-за засух, голаду і пагрозы харчовай бяспекі 1,8 млн бежанцаў прынялі Уганда, Судан, Кенія, Эфіопія і ДР Конга. У Еўропе з-за міграцыйнага крызісу краінамі, якія найбольш актыўна прымаюць бежанцаў, з’яўляюцца Грэцыя і Сербія. Гуманітарны крызіс Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі робіць найбольш прыступным да бежанства насельніцтва Сірыі, Йемена, Егіпта, Іарданіі, Ірака, Лівана і Турцыі. У Амерыцы прычынай бежанства з’яўляецца гвалт у Цэнтральнай Амерыцы (Гватэмала, Гандурас, Коста-Рыка і Мексіка).

***Папрацуем з атласам.*** Пакажыце на карце краіны з найбольшай колькасцю бежанцаў: Сірыю, Афганістан, Паўднёвы Судан.



Мал. 76. Лагер сірыйскіх бежанцаў у Германіі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Жэнеўская канвенцыя аб статусе бежанцаў**. Колькасць бежанцаў у свеце, якая павялічваецца, стварае праблему атрымання афіцыйнага статусу бежанца і вызначэння дакладных яго прыкмет для краін, што іх прымаюць.

**У свеце цікавага.** Паняцце «бежанец» з'яўляецца ўпершыню ў 1922 г. у першым пагадненні аб статусе рускіх і армянскіх бежанцаў. У ім былі вызначаны іх правы і прыняты першы праязны дакумент для бежанцаў — нансенаўскі пашпарт (мал. 77). Ён быў названы ў гонар палярнага даследчыка і першага Вярхоўнага камісара па справах бежанцаў Ф. Нансена. У 1942 г. гэты пашпарт прызналі ўрады 52 дзяржаў, і ён дзейнічаў да 1951 г.



Мал. 77. Старонка пашпарта Нансена

Паняцце «бежанец» і яго статус былі прынятыя ў 1951 г. у Жэневе ў Канвенцыі ААН аб статусе бежанцаў. Па вызначэнні ААН, бежанцамі лічацца асобы, якія: 1) могуць стаць ахвярай пераследу па прыкмеце расы, веравызнання, грамадзянства, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы, сексуальнай арыентацыі ці па палітычных поглядах; 2) знаходзяцца па-за краінай сваёй грамадзянскай прыналежнасці і не могуць ці не жадаюць карыстацца абаронай гэтай краіны з прычыны асцярогі.

**У свеце цікавага.** У той час як многія краіны павялічваюць квоты на прадастаўленне статусу бежанца, шэраг дзяржаў з кожным годам скарачае іх колькасць у мэтах бяспекі краіны. Складаная палітычная абстаноўка ў шэрагу краін Азіі і Афрыкі, што развіваюцца, прыводзіць да павелічэння колькасці людзей, якія падаюць прашэнне аб атрыманні прытулку. У 2016 г. было пададзена каля 2 млн новых хадайніцтваў аб прадастаўленні прытулку. Найбольшая колькасць новых просьб аб прытулку атрымліваюць Германія (722 тыс.), ЗША (262), Італія (123) і Турцыя (79 тыс.).

**Еўрапейскі міграцыйны крызіс.** Часткай глабальнага бежанства з'яўляецца Еўрапейскі міграцыйны крызіс. У 2015 г. шматразовае павелічэнне патоку бежанцаў і нелегальных мігрантаў у Еўрапейскі саюз з краін Паўночнай Афрыкі, Блізкага Усходу і Паўднёвай Азіі і адсутнасць адзінай палітыкі ЕС па іх прыёме і размеркаванні прывялі да міграцыйнага крызісу. Ён стаў найбуйнейшым з часоў Другой сусветнай вайны.

Міграцыйны крызіс абумоўлены пяццю асноўнымі прычынамі (мал. 78).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 78. Прычыны Еўрапейскага міграцыйнага крызісу

У 2016 г. у ЕС прыбыло 5,2 млн мігрантаў пераважна з Сірыі, Ірака і Афганістана. Каля 5,1 тыс. бежанцаў і мігрантаў загінулі або прапалі без вестак у Міжземнамор’і. У 2017 г. Міжземнае мора перасеклі каля 103 тыс. чалавек, пры гэтым каля 2,3 тыс. чалавек загінулі або прапалі без вестак.

Галоўнымі краінамі выхаду мігрантаў з’яўляюцца Сірыя, Афганістан, Ірак, Албанія, асноўнымі краінамі прыбыцця — Італія, Грэцыя, Кіпр і Іспанія. У той жа час краінамі, якія легалізавалі найбольшую колькасць мігрантаў, выступілі Германія, Швецыя, Італія, Швейцарыя і Францыя.

**Міграцыйная палітыка.** У краінах свету складваецца рознае становішча ў галіне міграцыі, актыўнасці патокаў эміграцыі і іміграцыі, а таксама адносна колькасці мігрантаў, якія пакідаюць і прыязджаюць у краіну. Таму для ўстанаўлення спрыяльнай для краіны міграцыйнай сітуацыі адбываецца яе рэгуляванне.

**Міграцыйная палітыка — гэта сістэма прынцыпаў, мэт і дзеянняў, з дапамогай якіх дзяржава рэгулюе патокі міграцыі.**

Дзяржаўная міграцыйная палітыка павінна быць накіравана на дасягненне мэт, адпаведных інтарэсам развіцця грамадства.

У залежнасці ад міграцыйнай сітуацыі ў краіне, суадносін іміграцыі і эміграцыі ў свеце вылучаюць палітыку ў галіне іміграцыі і палітыку ў галіне эміграцыі. Іміграцыйная палітыка рэгламентуе правілы і нормы прыняцця замежных грамадзян, а эміграцыйная палітыка — выезд грамадзян за мяжу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** У абагульненым выглядзе міграцыйную палітыку ў краінах свету можна падзяліць на наступныя віды: 1) міграцыйная палітыка не замінае эміграцыі, але жорстка рэгламентуе іміграцыю (напр., ЗША, Канада, Аўстралія і іншыя развітыя краіны); 2) міграцыйная палітыка не перашкаджае эміграцыі і спрыяе іміграцыі (напр., Ізраіль, Германія, нафтаздабываючыя краіны Паўднёва-Заходняй Азіі); 3) міграцыйная палітыка не перашкаджае ні эміграцыі, ні іміграцыі (напр., Туніс, Егіпет, Польшча); 4) міграцыйная палітыка накіравана на закрытасць краіны (Куба, КНДР).

У залежнасці ад стаўлення да мігрантаў вылучаюць: 1) палітыку асіміляцыі (зліццё аднаго народа з іншым са стратай адным з народаў сваёй мовы, культуры, нацыянальнай самасвядомасці); 2) палітыку мультыкультуралізму (падтрымка новых ідэнтычнасцей: этнічных, рэлігійных; мяркуе талерантнасць, уключэнне ў культурны працэс элементаў культур эмігрантаў, узаемнае пранікненне розных культур); 3) палітыку сацыяльнай інтэграцыі і культурна-моўнай адаптацыі (паспяховае ўліванне вялікай колькасці людзей, якія належаць да іншай супольнасці, у сацыякультурную прастору іншай культурнай супольнасці).

**Падвядзём вынікі.** Бежанства — гэта ... . Асноўнымі прычынамі бежанства з'яўляюцца ваенныя канфлікты, экалагічныя катастрофы, рэлігійная непрыязнасць. Асноўным рэгіёнам, куды накіраваліся асноўныя патокі бежанцаў, з'яўляецца ... . Еўрапейскі саюз адчувае міграцыйны крызіс. Дзяржавамі з найбольшай колькасцю бежанцаў з'яўляюцца ... .

***Праверым свае веды.*** 1. Назавіце асноўныя прычыны бежанства. 2. Які дакумент вызначае статус бежанца? 3. Якія краіны прынялі найбольшую колькасць бежанцаў?

***Ад простага да складанага.*** Сёння ў адзінай Еўропы няма агульнага рашэння, як рэгуляваць міграцыйную палітыку. У гэтым рэгіёне больш не засталося краін, гатовых працягваць палітыку адкрытых меж. Пазіцыі асобных дзяржаў і кіраўніцтва Еўрасаюза адрозніваюцца толькі тым, як лепш узяць паток мігрантаў пад кантроль. Прапануйце шляхі выхаду з міграцыйнага крызісу Еўропы.

***Падарожжа па Глабальнай сетцы.***

Сайт Упраўлення Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне